Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА "Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў"
___________Ю.П.Бондар
"___"___________2011 г.

# ПЕДАГОГІКА І МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ДЫСЦЫПЛІН

*Праграма дзяржаўнага экзамену для студэнтаў
напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01 Культуралогія
(фундаментальная)
спецыялізацыі 1-21 04 01-01 01 Тэорыя і гісторыя культуры*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2011

**Складальнікі**:

*А.І. Смолік,* загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, доктар культуралогіі, прафесар;

*І.А. Малахава,* загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*В.І. Вярбіцкая,* выкладчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**Рэцэнзенты:**

*Л.І. Казлоўская,* загадчык кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*І.В. Марозаў*, прафесар установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт”, доктар культуралогіі, прафесар

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

кафедрай культуралогіі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 5 ад 26.01.2011 г.);

саветам факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 5 ад 09.02.2011 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В.Б. Кудласевіч*
Адказны за выпуск *А.І. Смолік*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Актыўнае ўключэнне ў сучаснае паўсядзённае жыццё новых культурных з’яў і, як вынік, размыванне некалі адносна стабільнай міжкультурнай прасторы рознага статусу патрабуюць распрацоўкі адэкватных сённяшняй сітуацыі міжнавуковых падыходаў, якія адрозніваюцца ад звыклых “галіновых” метадаў, традыцый і школ. Яркім узорам узаемадзеяння педагогікі, псіхалогіі і культуралогіі з’яўляецца інтэграваны курс “Педагогіка і методыка выкладання спецыяльных дысцыплін”, з дапамогай якога будучыя культуролагі спасцігаюць назапашаны, сістэматызаваны і апрабаваны педагагічнай тэорыяй і практыкай вопыт. Вучэбная дысцыпліна “Педагогіка і методыка выкладання спецыяльных дысцыплін” уваходзіць у цыкл агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін новага пакалення вучэбных планаў.

Дадзеная праграма складзена з улікам змен адукацыйнай парадыгмы і вызначаецца стандартам вышэйшай прафесійнай адукацыі. Праграма адлюстроўвае ўнутраную логіку вывучаемых метадычных праблем, арыентуе будучых спецыялістаў на дзейнасць па авалоданні сучаснымі тэхналогіямі навучання і выхавання.

*Мэтай* дзяржаўнага экзамену па “Педагогіцы і методыцы выкладання спецыяльных дысцыплін” з’яўляецца высвятленне сфарміраванасці ў студэнтаў трывалых навыкаў і ўменняў, якія неабходны для рацыянальнай арганізацыі выкладання культуралагічных дысцыплін як вучэбнага прадмета, так і для паспяховага вырашэння развіваючых і выхаваўчых задач.

Падчас падрыхтоўкі да дзяржаўнага экзамену і ў працэсе яго вырашаюцца наступныя *задачы:*

– высвятленне грунтоўнасці ведаў па тэарэтычных асновах адукацыі і выхавання асобы навучэнца;

– выяўленне глыбіні засваення выпускнікамі ўніверсітэта агульнадыдактычных прынцыпаў, метадаў і прынцыпаў выкладання;

– вызначэнне ступені авалодання будучымі выкладчыкамі метадамі, сродкамі, спосабамі работы выкладчыка з навучэнцамі, з дапамогай якіх дасягаецца авалоданне культуралагічнымі ведамі, уменнямі і навыкамі, фарміруецца светапогляд, развіваюцца здольнасці навучэнцаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– выяўленне ў выпускнікоў уменняў, якія неабходны ім для выкарыстання разнастайных форм, відаў адукацыі, самаадукацыі і творчага пошуку;

– праверка ўзроўню авалодання выпускнікамі сучаснымі адукацыйнымі тэхналогіямі арганізацыі вучэбнага працэсу па культуралагічных дысцыплінах.

У працэсе падрыхтоўкі студэнтаў да дзяржаўнага экзамену па дадзенай праграме яны павінны сістэматызаваць і паглыбіць веды па:

– педагогіцы і методыцы выкладання спецыяльных дысцыплін;

– прафесійных патрабаваннях да выкладчыка культуралогіі;

– прынцыпах і метадах выкладання культуралагічных дысцыплін;

– традыцыйных і сучасных адукацыйных тэхналогіях арганізацыі вучэбнага працэсу па сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах;

– каляндарным, перспектыўным і бягучым планаванні працы выкладчыка;

– спецыфіцы працы з тэхнічнымі сродкамі навучання на занятках па культуралогіі;

– формах і відах пазааўдыторных заняткаў па культуралагічных дысцыплінах.

Студэнт павінен *прадэманстраваць:*

– уменне канструяваць, аналізаваць і ажыццяўляць на практыцы працэс культуралагічнай адукацыі на ўроку і іншых выявах, схемах і табліцах для прэзентацыі на ўроках, лекцыях і семінарскіх занятках;

– планаванне ўрокаў, падбор неабходнага тэарэтычнага і практычнага матэрыялу для раскрыцця вывучаемых працэсаў і з'яў культуры;

– арганізацыю самастойнай пазнавальнай работы навучэнцаў;

– выкарыстоўванне нагляднасці на занятках па культуралогіі;

– аналізаванне культурных працэсаў і з'яў, супастаўленне з палажэннямі педагагічнай тэорыі;

– ажыццяўленне ідэалагічнага і эстэтычнага выхавання навучэнцаў у працэсе педагагічнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ЗМЕСТ ДЗЯРЖАЎНАГА ЭКЗАМЕНУ

## Р а з д з е л I. Метадалагічныя і тэарэтычныя асновы педагогікі

### Тэма 1. Месца педагогікі ў сістэме вышэйшай адукацыі

Значэнне дысцыпліны ў падрыхтоўцы культуралагічных кадраў. Прадмет, змест, мэта і задачы, структура вучэбнага курса. Міжпрадметныя сувязі дадзенай дысцыпліны. Віды вучэбных заняткаў. Крыніцы інфармацыі па праблематыцы вучэбнай дысцыпліны. Формы кантролю.

Адметнасці псіхолага-педагагічных вучэбных дысцыплін. Наяўнасць падручнікаў і адпаведнасць іх зместу адукацыйнага стандарту і тыпавым праграмам. Праблемы выкладання педагагічных дысцыплін. Аб’ектыўныя і суб’ектыўныя складанасці.

### Тэма 2. Прадмет і асноўныя катэгорыі педагогікі

Педагогіка як навука аб адукацыі і выхаванні. Педагогіка як мастацтва. Асноўныя паняцці педагогікі: выхаванне як сістэма мэтанакіраваных метадаў і прыёмаў уздзеяння на асобу; адукацыя як працэс і вынік перадачы і засваення асобай пэўнай сістэмы ведаў, уменняў і навыкаў у мэтах развіцця асобы. Паняцце педагогікі як мастацтва; педагагічная творчасць, педагагічная інтуіцыя як крыніца эфектыўнай дзейнасці педагога. Узаемадзеянне педагагічных навук і мастацтва ў педагагічных даследаваннях і дзейнасці.

### Тэма 3. Дыферэнцыяцыя і інтэграцыя педагагічных навук

Асноўныя галіны педагагічнай навукі: гісторыя педагогікі, народная педагогіка, агульная педагогіка, параўнальная педагогіка, дыдактыка і асобныя методыкі, узроставая педагогіка, тэорыя выхавання, дэфекталогія, прафесійная педагогіка, педагогіка адукацыі дарослых і інш.

Месца педагогікі ў сістэме навук аб чалавеку і ў агульнанавуковых ведах. Узаемасувязь педагогікі з філасофіяй, культуралогіяй, сацыялогіяй, паліталогіяй, псіхалогіяй, фізіялогіяй, этыкай, эстэтыкай і іншымі навукамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 4. Метадалогія і метады педагагічнай навукі

Метадалогія навуковага даследавання. Узроўні метадалогіі: агульнанавуковы, прыватнанавуковы (або спецыяльны), прадметна-тэматычны. Метады навукова-педагагічных даследаванняў. Класіфікацыя метадаў навукова-педагагічных даследаванняў. Тэарэтычныя метады даследавання. Эмпірычныя метады даследавання. Дапаможныя метады даследавання. Педагагічны эксперымент: канстатуючы, фарміруючы (стваральны), праверачны. Метады якаснай і колькаснай апрацоўкі вынікаў даследавання: рэгістрацыя, шкаліраванне, кантэнт-аналіз і інш.

## Тэма 5. Сутнасць і змест адукацыі

Паняцце канцэпту адукацыі. Фарміраванне сістэматызаваных ведаў, уменняў і навыкаў, поглядаў і перакананняў – мэта адукацыі. Асноўныя шляхі атрымання адукацыі. Значэнне адукацыі для развіцця асобы. Гістарычныя і сучасныя тэндэнцыі развіцця адукацыі. Агульначалавечыя і нацыянальныя каштоўнасці як аснова фарміравання зместу адукацыі. Агульная, політэхнічная, прафесійная адукацыя, іх адзінства і ўзаемасувязь. “Фармальная” і “матэрыяльная” адукацыя. Веды, уменні і навыкі ў сістэме зместу адукацыі. Характарыстыка дакументаў, у якіх адлюстроўваецца змест адукацыі: адукацыйныя стандарты, вучэбны план, вучэбная праграма, падручнік, вучэбны дапаможнік. Сучасныя носьбіты навучальнай інфармацыі (друкаваныя, аўдыявізуальныя, камп’ютарныя) і іх выкарыстанне ў сістэме адукацыі.

Узроўні мастацкай і культуралагічнай адукацыі: агульнаадукацыйны, паглыблены, прафесійны.

## Тэма 6. Дыдактыка як тэарэтычная аснова навучання. Асноўныя катэгорыі дыдактыкі

Дыдактыка як частка педагогікі. Развіццё дыдактыкі ў працах Я. Каменскага, І. Песталоцi, Ф. Дыстэрвега, І. Герберта і інш. Асноўныя катэгорыі дыдактыкі. Працэс навучання як прадмет даследавання дыдактыкі. Паняцце дыдактычнай сістэмы. Характарыстыка асноўных гістарычных і сучасных дыдактычных сістэм (традыцыйная, педацэнтрысцкая, змешаная). Абагульненне педагагічнага вопыту на эмпірычным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

узроўні: міфалогія, традыцыі, абрады. Навуковае асэнсаванне працэсу адукацыі ў працах старажытных мысліцеляў (Сакрат, Платон, Арыстоцель, Дэмакрыт, Квінтыліян і інш.). Педагагічныя ідэі эпохі Сярэднявечча. Гуманістычны падыход да адукацыі асобы ў перыяд Адраджэння. Дыферэнцыяцыя і інтэграцыя педагагічных ведаў у ХХІ ст.

Развіццё педагагічнай думкі і асветы ў Беларусі. Народная педагогіка, яе асноўныя прынцыпы: прыродазгоднасць, дэмакратычнасць, гуманізм, цэласнасць успрымання і фарміравання асобы, традыцыяналізм і інш. Асветніцкая і педагагічная дзейнасць Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага. Развіццё асветы ў ВКЛ. Гуманістычная накіраванасць асветніцкай дзейнасці Ф. Скарыны, С. Буднага. Стварэнне ўсходнеславянскіх граматык (Л. Зізаній, М. Сматрыцкі). Педагагічныя погляды С. Полацкага. Рэформы сістэмы адукацыі ў XVIII–XIX стст. Педагагічныя погляды прадстаўнікоў нацыянальна-культурнага адраджэння (Э. Пашкевіч, Я. Коласа, М. Багдановіча, М. Гарэцкага і інш.).

## Тэма 7. Праблема мэтавызначэння ў педагогіцы і яе вырашэнне на розных этапах развіцця грамадства

Развіццё педагогікі ў межах філасофіі ў старажытных цывілізацыях і Сярэднявеччы. Адмаўленне аб'ектыўных заканамернасцей выхавання прыхільнікамі ідэалістычнага напрамку ў педагогіцы. Гуманістычны падыход да навучання і выхавання асобы. Разуменне сутнасці навучання і выхавання прадстаўнікамі матэрыялізму. Метадалагічная аснова марксісцка-ленінскай педагогікі.

Мэты і задачы навучання ў працах заходнееўрапейскіх педагогаў і псіхолагаў ХХ ст. Выкладанне і навучанне як асноўныя віды дыдактычнай дзейнасці. Паняцце адукацыі як працэсу і выніку засваення асобай ведаў, уменняў і навыкаў. Змест адукацыі як сістэма ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных для фарміравання ўсебакова развітой асобы. Роля самаадукацыі ў духоўным развіцці асобы.

## Тэма 8. Канцэпцыя адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь

Асноўныя кірункі сучаснай рэформы сістэмы адукацыі за мяжой і ў Рэспубліцы Беларусь. Шматузроўневая сістэма адукацыі. Сутнасць працэсу навучання як узаемасувязі двух

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

відаў дзейнасці: выкладання і навучання. Функцыі працэсу навучання: адукацыйная, выхаваўчая, развіццёвая. Структура працэсу навучання (мэта, змест, метады, сродкі, адукацыйныя формы, дзейнасць настаўніка і вучня, вынік). Асноўныя этапы навучання: успрыманне, разуменне, асэнсаванне, абагульненне, замацаванне, прымяненне. Сучасныя віды навучання: тлумачальна-ілюстрацыйны, праблемны, праграмаваны і інш. Асаблівасці іх рэалізацыі ў працэсе выкладання мастацкіх дысцыплін.

Выкладанне як сістэматызаваная дзейнасць выкладчыка па арганізацыі, ажыццяўленні і кіраванні працэсам фарміравання ў навучэнцаў пэўных ведаў, уменняў і навыкаў, развіцці іх навуковага светапогляду.

### Тэма 9. Заканамернасці навучання

Навучанне як педагагічны працэс. Характар навучання і яго залежнасць ад грамадскіх адносін, патрэбнасцей, палітыкі, узроўню навукі і тэхнікі, педагогікі і школы. Двухбаковы працэс навучання. Калектыўнае і індывідуальнае навучанне. Навучанне – найважнейшая частка выхавання.

Паняцце аб заканамернасцях працэсу навучання як аб'ектыўных, неабходных, агульных і ўстойлівых узаемасувязей у працэсе навучання. Характарыстыка асноўных заканамернасцей навучання (адпаведнасць уздзеянняў настаўніка пазнавальным, інтэлектуальным і іншым магчымасцям навучэнцаў, адпаведнасць магчымасцей тэхнічных сродкаў навучання дзейнасці настаўніка і навучэнцаў і інш.).

### Тэма 10. Прынцыпы навучання

Прынцыпы навучання як асноватворныя палажэнні арганізацыі дыдактычнага працэсу. Распрацоўка прынцыпаў навучання ў гісторыі педагагічнай думкі (А. Дыстэрвег, Я. Каменскі, І. Песталоці, К. Ушынскі і інш.). Сістэма дыдактычных прынцыпаў. Узаемасувязь прынцыпаў навучання. Суадносіны прынцыпаў і правіл навучання. Характарыстыка асноўных прынцыпаў навучання (сістэматычнасць, паслядоўнасць, свядомасць і актыўнасць, нагляднасць, трываласць ведаў, навуковасць і інш.). Асаблівасці выкарыстання прынцыпаў навучання ў выкладанні дысцыплін культуралагічнага цыкла.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 11. Метады навучання і іх класіфікацыя

Паняцце аб метадзе навучання як спосабе перадачы ведаў, уменняў і навыкаў, з дапамогай якога забяспечваецца развіццё асобы навучэнца. Методыка навучання як сістэма мэтазгодных метадаў і прыёмаў выкладання і засваення навуковых ведаў, уменняў і навыкаў.

Класіфікацыя метадаў навучання: па крыніцах ведаў (славесныя, наглядныя, практычныя), па характары навучальнай дзейнасці (рэпрадуктыўныя, праблемна-пошукавыя, творчыя), па дыдактычнай мэце (атрыманне новых ведаў, замацаванне ведаў, метады кантролю), па месцы ў структуры навучальнай дзейнасці (метады арганізацыі і ажыццяўлення навучальнай дзейнасці, метады стымулявання, кантролю і самакантролю).

Узаемасувязь метадаў навучання як умова эфектыўнасці адукацыі. Асаблівасці рэалізацыі дыдактычных метадаў у сістэме культуралагічнай адукацыі.

## Тэма 12. Асноўныя сродкі навучання

Падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, аўдыявізуальныя прыстасаванні і іншыя сродкі навучання. Псіхафізіялагічныя асновы ўспрымання аўдыявізуальнай інфармацыі. Тыпалогія аўдыя-, відэа,- камп’ютарных вучэбных дапаможнікаў. Тыпалогія вучэбных відэазапісаў: банк аўдыя-, відэа-, камп’ютарных матэрыялаў.

Дыдактычныя прынцыпы пабудовы аўдыя-, відэа-, камп’ютарных вучэбных дапаможнікаў. Інтэрактыўныя тэхналогіі.

Аўдыявізуальныя тэхналогіі. Фотаздымак. Аптычная праекцыя (статычная і дынамічная). Гуказапіс (аналагавы і лічбавы). Тэлебачанне і відэазапіс (аналагавы і лічбавы). Камп’ютары і мультымедыйныя сродкі.

## Тэма 13. Формы навучання. Дыферэнцыяцыя і індывідуалізацыя працэсу навучання

Паняцце аб форме навучання як знешнім выражэнні арганізацыі вучэбнага працэсу. Залежнасць формы навучання ад мэт, зместу, метадаў і сродкаў, складу навучэнцаў, матэрыяльных умоў.

Класіфікацыя формаў навучання: індывідуальныя, калектыўныя, групавыя, класныя і пазакласныя, школьныя і пазашкольныя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Класна-ўрочная сістэма навучання, яе характарыстыка. Урок як асноўная форма навучання. Тыпы ўрокаў. Структура ўрока. Іншыя формы навучання: практыкум, семінар, вучэбная экскурсія, факультатыў, самастойная праца вучняў. Формы актыўнага навучання. Спецыяльныя формы вучэбных заняткаў. Прынцыпы аптымальнага адбору арганізацыйных формаў навучання.

### Тэма 14. Біясацыякультурная сутнасць асобы. Узроставыя і індывідуальныя асаблівасці асобы

Біясацыякультурная сутнасць асобы. Асноўныя фактары фарміравання асобы: спадчыннасць, асяроддзе, выхаванне. Асаблівасці ўздзеяння спадчыннасці і асяроддзя (геаграфічнага, сацыяльнага, сямейнага) на развіццё асобы. Узроставыя і індывідуальныя асаблівасці развіцця асобы і іх улік у асобасна-арыентаваным працэсе выхавання. Паняцце здольнасцей і задаткаў. Акселерацыя. Адоранасць. Характарыстыка перыядызацыі сацыяльнага станаўлення асобы на розных гістарычных этапах развіцця грамадства (Арыстоцель, Я. Каменскі, Ж.-Ж. Русо, С. Полацкі і інш.). Сучасная айчынная педагагічная перыядызацыя станаўлення асобы. Роля Я. Коласа, Б.Тарашкевіча, М. Гарэцкага, В. Ластоўскага, І.Буйніцкага, У. Галубка, Р. Шырмы і іншых дзеячаў беларускай культуры ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

### Тэма 15. Асоба як суб'ект і аб'ект выхавання

Выхаванне як мэтанакіраваны фактар развіцця асобы. Навучэнец як суб'ект і аб'ект выхаваўчага працэсу. Вылучэнне выхавання ў самастойны від дзейнасці на ранніх этапах развіцця грамадства.

Паняцце мэты выхавання як мяркуемага выніку, на дасягненне якога накіравана педагагічная дзейнасць. Аб'ектыўныя і суб'ектыўныя фактары, якія ўплываюць на вызначэнне мэты выхавання. Грамадскія і асобасныя мэты выхавання і асаблівасці іх узаемадзеяння. Канкрэтна-гістарычны характар мэт выхавання і іх адлюстраванне ў педагагічнай практыцы і культуры на розных этапах развіцця грамадства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма 16. Сутнасць працэсу выхавання і яго арганізацыя

Паняцце зместу выхавання. Выхаваўчы працэс як свядома арганізаваная сістэма ўзаемадзеяння педагогаў і навучэнцаў, арганізацыі і стымулявання іх актыўнай дзейнасці па авалоданні сацыякультурным вопытам. Шматфактарны характар выхаваўчага працэсу (узаемадзеянне сям'і, школы, сродкаў камунікацыі і г.д.). Асноўныя этапы арганізацыі выхаваўчага працэсу і іх змест. Бесперапыннасць працэсу выхавання. Варыятыўнасць вынікаў выхаваўчага ўзаемадзеяння. Сямейнае выхаванне як своеасаблівы сацыякультурны інстытут. Сутнасць і спецыфіка сямейнага выхавання. Роля калектыву ў фарміраванні асобы. Паняцце аб выхаваўчым калектыве. Выхаваўчы калектыў як педагагічна арганізаваная сістэма ўзаемаадносін.

### Тэма 17. Заканамернасці і прынцыпы працэсу выхавання

Непарыўнасць адукацыі і выхавання. Уплыў выхавання на фарміраванне светапогляду і маральнае аблічча, развіццё волі і характару асобы. Абумоўленасць выхавання грамадскімі адносінамі людзей.

Характарыстыка асноўных прынцыпаў выхавання (сувязь выхавання з жыццём, цэласнасць працэсу, адзінства ўсіх кампанентаў выхаваўчага працэсу, гуманістычны падыход, апора на пазітыўнае ў асобе, улік індывідуальных і ўзроставых асаблівасцей, адзінства дзеянняў і патрабаванняў усіх удзельнікаў выхаваўчага працэсу). Узаемасувязь прынцыпаў выхавання. Выхаванне, самавыхаванне і перавыхаванне. Асаблівасці іх узаемадзеяння ў сацыяльна-культурнай сферы.

### Тэма 18. Сутнасць і змест эстэтычнага выхавання

Мэты, задачы эстэтычнага выхавання; каштоўнасная арыентацыя асобы, удзел у стварэнні і абароне эстэтычных каштоўнасцей. Асноўныя кампаненты эстэтычнага выхавання; фарміраванне здольнасцей да ўспрымання эстэтычных каштоўнасцей, засваенне тэорыі і гісторыі мастацтва, далучэнне да творчай дзейнасці ў розных відах мастацтва (літаратурнай, выяўленчай, музычнай, тэатральнай і інш.). Улік узроставых асаблівасцей ва ўспрыманні і разуменні мастацтва і мастацка-творчай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 19. Метады арганізацыі выхавання і самавыхавання асобы

Паняцце аб метадах выхавання. Суадносіны паняццяў “метад”, “прыём”, “сродак” у працэсе выхавання, іх узаемасувязь. Класіфікацыя метадаў выхавання. Метады фарміравання свядомасці асобы: тлумачэнне, гутарка, дыспут, лекцыя і інш. Метады арганізацыі дзейнасці і паводзін асобы: педагагічнае патрабаванне (прамое і ўскоснае), практыкаванне, выхаваўчыя сітуацыі і інш.

Метады педагагічнага стымулявання (гуманныя і негуманныя): заахвочванне, пакаранне, спаборніцтва, педагагічная перспектыва і інш. Залежнасць метадаў выхавання ад мэт, зместу, прынцыпаў выхавання. Асаблівасці выкарыстання метадаў выхавання ў сферы вольнага часу. Прамыя і ўскосныя метады выхавання. Характарыстыка прамых метадаў выхавання (унушэнне, перакананне, пакаранне). Ускосныя метады выхавання (апасродкаванне, паралельных педагагічных дзеянняў, перспектывы і інш.).

Віды дзейнасці (гульнёвая, вучэбная, працоўная, мастацка-творчая, спартыўная і інш.) як сродак выхавання асобы навучэнца.

## Тэма 20. Педагагічнае майстэрства і яго сутнасць

Паняцце педагагічнага майстэрства як спалучэнне тэарэтычных ведаў, практычных уменняў, педагагічных здольнасцей і гуманістычнай культуры выкладчыка. Сутнасць педагагічнага майстэрства. Гуманістычная накіраванасць педагога. Асноўныя педагагічныя здольнасці і шляхі іх развіцця (камунікатыўныя, перцэптыўныя, арганізатарскія, прагнастычныя і інш.). Педагагічная тэхніка і педагагічная тэхналогія. Творчасць у структуры педагагічнага майстэрства. Педагагічны такт і яго праявы ў дзейнасці педагога-культуролага. Гуманістычная педагогіка (педагогіка партнёрства, ці супрацоўніцтва) як практычнае ўвасабленне педагагічнага майстэрства, яе асноўныя прынцыпы: асобасны падыход, павага да вучня, суб’ект-суб’ектныя адносіны, сутворчасць). Шляхі ўдасканалення педагагічнага майстэрства педагога-культуролага. Самаадукацыя і майстэрства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел II. Методыка выкладання спецыяльных дысцыплін

### Тэма 1. Асаблівасці выкладання тэарэтыка-культуралагічных дысцыплін

Сувязь культуралогіі з педагогікай, псіхалогіяй, мастацтвазнаўствам, філасофіяй, сацыялогіяй, этнаграфіяй, рыторыкай і інш. Унутрыкурсавыя сувязі. Рэтраспектыўныя, перспектыўныя сувязі. Духоўна-змястоўны аспект. Інстытуцыйны аспект. Марфалагічны аспект.

Псіхолага-педагагічныя аспекты выкладання культуралогіі.

Рацыянальная арганізацыя вывучэння культуралагічных дысцыплін як вучэбных прадметаў, вырашэнне развіваючых і выхаваўчых задач – прызначэнне курса "Методыка выкладання культуралогіі". Развіццё і змена інтарэсаў навучэнцаў пад уплывам працэсу навучання культуралогіі.

### Тэма 2. Асноўныя раздзелы методыкі і іх характарыстыка

Агульныя асновы методыкі. Метадычныя школы і погляды. Прынцыпы і метады выкладання. Сістэма вывучэння культуралагічных дысцыплін на розных відах заняткаў. Сістэма самастойнай работы і яе разнастайнасць. Шляхі, метады, прыёмы вывучэння культуралагічных дысцыплін; эмацыянальны і лагічны падыходы.

### Тэма 3. Станаўленне і развіццё методыкі выкладання культуралогіі

Вытокі культуралагічнай адукацыі. Вылучэнне Л. Уайтам культуралогіі ў самастойную дысцыпліну ў комплексе грамадскіх навук. Выкладанне элементаў культуралагічных ведаў студэнтам гуманітарных факультэтаў у савецкіх ВНУ. Увядзенне культуралагічных дысцыплін у сістэму вышэйшай адукацыі ў 80–90-х гг. XX ст.

Першы дзяржаўны адукацыйны стандарт па культуралогіі ў Расіі (1992 г.). Стварэнне Вышэйшай школы культуралогіі ў Маскве (1995 г.).

Увядзенне культуралогіі як агульнаадукацыйнай дысцыпліны ў ВНУ Беларусі. Падрыхтоўка культуралагічных кадраў у беларускіх ВНУ. Ліцэнзіі на права падрыхтоўкі культуралагічных кадраў у беларускіх вышэйшых навучальных установах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма 4. Дзяржаўныя дакументы, якія рэгулююць культуралагічную адукацыю

Дзяржаўны адукацыйны стандарт па спецыяльнасці “Культуралогія” і яго структура. Магчымасці і прыёмы выкарыстання стандарту пры падрыхтоўцы вучэбных курсаў па культуралогіі.

Вучэбныя планы і тыпы. Змест планаў. Праграмы па культуралагічных дысцыплінах: тыпавыя і вучэбныя.

Методыка стварэння вучэбных планаў і праграм па культуралагічных дысцыплінах.

Распрацоўка і выданне на постсавецкай прасторы вучэбнай і вучэбна-метадычнай літаратуры па культуралогіі (А.І. Арнольдаў, П.С. Гурэвіч, Г.В. Драч, Б.С. Ерасаў, Л.К. Кухто, І.Я. Левяш, У.Ф. Мартынаў, І.В. Марозаў, А.І. Смолік, І.Я. Шыршоў, В.Р. Языковіч і інш.). Характарыстыка відаў і тыпаў вучэбнай літаратуры па культуралогіі.

### Тэма 5. Прынцыпы адбору вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў па культуралогіі

Характарыстыка відаў і тыпаў вучэбнай літаратуры па культуралогіі. Вызначэнне аўтарскіх падыходаў да вывучэння культуры. Аналіз выбранага аўтарамі паняційна-тэрміналагічнага апарату, прынцыпаў пабудовы вучэбнага дапаможніка, навукова-даведачнага і метадычнага забеспячэння.

Адпаведнасць падручніка дзяржаўнаму адукацыйнаму стандарту і праграмам курсаў. Структуры падручніка. Прынцыпы падачы інфармацыі. Наяўнасць асноўных паняццяў і тэрмінаў.

Параметры аналізу вучэбных выданняў. Новыя канцэпцыі і метадалагічныя падыходы, якія сфарміраваліся ў культуралагічнай навуцы; раскрыццё розных бакоў і аспектаў гісторыі і культуралогіі; адбор фактычнага матэрыялу; выкарыстанне ў вучэбных выданнях культуралагічных тэкстаў; педагагічныя, дыдактыка-метадычныя аспекты.

### Тэма 6. Метады выкладання культуралогіі

Класіфікацыя метадаў у сучаснай метадычнай навуцы. Агульнадыдактычныя прынцыпы выкладання культуралогіі. Прынцып навуковасці. Прынцып даступнасці і сістэмнасці. Прынцып свядомай і актыўнай дзейнасці навучэнцаў пры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вядучай ролі выкладчыка. Прынцып нагляднасці. Прынцып выхаваўчай накіраванасці.

Метады выкладання культуралогіі: метад творчага аналізу, эўрыстычны метад, даследчы метад, рэпрадуктыўны і прадуктыўны метады.

## Тэма 7. Віды аўдыторнай і пазааўдыторнай дзейнасці

Асноўныя тыпы і віды вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па засваенні культуралагічных ведаў: чытанне вучэбнай і манаграфічнай літаратуры, лекцыі, канспектаванне пэўных тэкстаў, падрыхтоўка рэфератаў, складанне планаў і тэзісаў, складанне і каменціраванне табліц, схем. Падбор цытат і ўрыўкаў, выкананне дамашніх заданняў, аналіз тэкстаў на сайтах Інтэрнэт і інш. Прынцыпы класіфікацыі вучэбных заняткаў па культуралогіі.

## Тэма 8. Урокі культуралагічнага блока: сутнасць і своеасаблівасць

Урок як калектыўная форма навучання. Віды ўрокаў: урок-паўтарэнне, урок камбінаванай будовы, кантрольны ўрок, урок-гутарка, урок-дыскусія, урок-дыспут, урок-даследаванне, урок-доказ, урок-дэманстрацыя, урок-алімпіяда, урок-віктарына, урок-гульня, урок-турнір, урок-экскурсія.

Структура ўрока як сукупнасць розных варыянтаў узаемадзеяння паміж элементамі ўрока. Стуктура ўрока вывучэння новага матэрыялу. Структура ўрока фарміравання ўменняў і навыкаў. Стуктура ўрока праверкі ведаў. Структура ўрока паўторна-абагульняючага. Структура камбінаванага ўрока.

## Тэма 9. Нетрадыцыйныя ўрокі культуралагічнага блока

Альтэрнатыўныя падыходы да вырашэння і ацэнкі культуралагічных праблем. Нетрадыцыйныя формы ўрокаў: урок-прэзентацыя, урок-прэс-канферэнцыя, урок-інтэрв’ю, урок-турнір і інш. Увядзенне дыялога, спрэчкі, дыскусіі, далучэнне да навуковай дзейнасці.

Інтэграваныя ўрокі па культуралогіі як спосаб цэласнага ўспрымання культурных з’яў і працэсаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 10. Гульня як нетрадыцыйная форма ўрока

Гульня на ўроку як актыўная форма вучэбных заняткаў. Мэта гульні. Мадэляванне пэўнай з'явы, працэсу культуры. Прыкметы вучэбнай гульні: наяўнасць дыялога, уяўленне нейкай сацыякультурнай сітуацыі. Віды вучэбнай гульні: гульня-абмеркаванне, гульня-даследаванне. Дзелавыя гульні. Падвіды дзелавых гульняў.

Рэтраспектыўныя гульнявыя заданні. Фармальна-рэканструктыўныя гульні. Нефармальна-канструктыўныя гульні.

Ролевыя і неролевыя гульні. Конкурсныя гульні. Маршрутныя гульні.

Удзельнікі гульні: вядучыя, акцёры, гледачы, эксперты.

Ацэнка рэзультатыўнасці гульні.

## Тэма 11. Суадносіны формы і зместу лекцый па культуралогіі як метадычная праблема

Лекцыйны метад выкладання культуралагічных ведаў. Лекцыя як сістэматызаванае вуснае выкладанне часткі раздзела культуралагічных дысцыплін. Адлюстраванне ў лекцыі важнейшых праблем і пытанняў, асноўных з'яў і працэсаў культуры. Улік узросту і падрыхтаванасці навучэнцаў пры арганізацыі лекцыйных форм навучання. Даступны і займальны змест лекцыйнага матэрыялу. Пытанні і гутаркі выкладчыка з навучэнцамі па праблеме лекцыі. Самастойная пазнавальная дзейнасць навучэнцаў па выніках лекцыі.

## Тэма 12. Семінар як форма арганізацыі навучальнага працэсу

Элементы семінарскіх заняткаў у школе. Спецыфіка заданняў для самастойнага паглыбленага вывучэння асобных праблем культуры. Вывучэнне культуралагічных тэкстаў у працэсе падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў. Дапамога выкладчыка ў выбары тэмы, складанні плана, вызначэнні літаратуры па праблеме семінара. Каментарыі, даклады, дыспуты на семінарскіх занятках. Дыскусіі на семінарах. Структураваная дыскусія. Характэрныя тыпы ўдзельнікаў дыскусіі. Абагульненне і заключнае слова выкладчыка.

Формы кантролю і самакантролю на семінарскіх занятках па культуралагічных дысцыплінах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма 13. Факультатыў па культуралагічных дысцыплінах

Задавальненне індывідуальных схільнасцей і запытаў, інтарэсаў навучэнцаў у сферы культуры, навукі і мастацтва на факультатыўных курсах.

Факультатыўныя заняткі і асаблівасці іх правядзення. Факультатыў як эфектыўная форма навучання і выхавання навучэнцаў. Патрабаванні да факультатыўных заняткаў. Арганізацыя факультатыва: добраахвотны запіс навучэнцаў; уключэнне ў расклад, улік наведвання і паспяховасці; адзнака ў дзённіку (залiковай кніжцы). Методыка правядзення факультатыўных заняткаў. Формы працы на факультатыве. Літаратура і іншыя сродкі навучання на факультатыўных занятках. Выкарыстанне нетрадыцыйных форм вучэбнай дзейнасці.

### Тэма 14. Пазааўдыторная (пазакласная) самастойная работа па культуралагічных дысцыплінах

Разнастайнасць формаў і відаў пазааўдыторнай работы. Умовы эфектыўнасці пазааўдыторнай работы. Спалучэнне і лагічная звязанасць пазакласных заняткаў з паўрочнай працай. Творчы характар самастойнай работы. Улік узроставых псіхалагічных асаблівасцей і адукацыйнага ўзроўню навучэнцаў пры арганізацыі самастойнай пазнавальнай дзейнасці. Даступнасць і займальнасць прапануемага для самастойнай работы матэрыялу. Арганізацыя ўліку і кантролю за самастойнай пазнавальнай дзейнасцю навучэнцаў.

### Тэма 15. Сутнасць і змест тэхналогіі навучання па культуралагічных дысцыплінах

Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі арганізацыі вучэбнага працэсу па культуралогіі. Сутнасць і змест тэхналогіі навучання. Традыцыйная тэхналогія і яе кампаненты. Рэпрадуктыўна-інфармацыйны падыход як аснова традыцыйнай тэхналогіі. Настаўнік, падручнікі – крыніца ведаў, вучань – аб’ект.

Змяненне падыходаў да спосабаў актывізацыі мысліцельнай дзейнасці навучэнцаў. Эўрыстычна-даследчы, праблемны падыходы – аснова сучаснай тэхналогіі. Рэгулюючая функцыя кіравання пазнавальным працэсам. Стварэнне праблемных сітуацый, пабудова заняткаў па прынцыпе лагічных мысліцельных сітуацый. Алгарытмізацыя, распрацоўка і прымяненне апорных сістэм, сігналаў, выяў, табліц. Развіваючы характар сучасных тэхналогій.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма 16. Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій арганізацыі вучэбнага працэсу па культуралогіі

Тэхналогія перспектыўных ліній: вылучэнне асобнай тэмы як скразной лініі ў праграме па культуралогіі.

Тэхналогія модульнага навучання. Тэхналагічная карта вывучэння модуля. Модуль-блок. Рэйтынгавая ацэнка паспяховасці.

Дальтон-план і праца па ім. План-графік урокаў-заданняў, кансультацый і карэкцыі, выніковыя заняткі.

Французская майстэрня як лакальная тэхналогія. Разнастайнасць спосабаў працы. Адмаўленне ад бягучых ацэнак. Акцэнт на самастойную работу навучэнцаў.

Праектная тэхналогія і яе этапы: падрыхтоўка, планаванне, даследаванне, аналіз інфармацыі, прэзентацыя, ацэнка і рэфлексія. Выкарыстанне мноства падыходаў.

### Тэма 17. Тэарэтычныя асновы праблемнага навучання культуралагічных дысцыплін

Сутнасць праблемнага навучання. Праблемнае навучанне як творчы працэс. Сутнасць праблемнай інтэрпрэтацыі вучэбнага матэрыялу. Вызначэнне гіпотэзы, яе абгрунтаванне і праверка. Пераўтварэнне праблемнай сітуацыі ў праблемную задачу. Праблемная задача. Мадэль пошуку вырашэння.

Умовы паспяховасці праблемнага навучання. Псіхолага-педагагічныя мэты праблемнага навучання. Формы праблемнага навучання. Метад праектаў. Розныя варыянты праектаў.

Мадэляванне сітуацыі ўяўляемай сустрэчы з рэальнай асобай вядомага культуролага. Вобразная рэканструкцыя матэрыяльных помнікаў культуры і найбольш значных эпізодаў развіцця беларускай культуры.

### Тэма 18. Аналіз тэкстаў навуковых прац айчынных і замежных культуролагаў, статыстычных матэрыялаў і сацыялагічных даследаванняў

Аналіз культуралагічных тэкстаў як частка вучэбных заняткаў. Навучальны і педагагічна арыентаваны характар аналізу. Мэтанакіраванасць аналізу.

Агульныя патрабаванні да аналізу тэарэтычных і эмпірычных матэрыялаў: узбагаціць новымі культуралагічнымі веда-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мі; фарміраваць аналітычныя ўменні; развіваць камунікатыўныя навыкі; паглыбіць навуковае мысленне; развіваць навукова-даследчыя здольнасці; садзейнічаць выхаванню асобы.

Непасрэдныя патрабаванні: асэнсавана чытаць культуралагічны кантэкст; вызначыць асноўную сутнасць разглядаемай аўтарам праблемы; бачыць узаемасувязь культурнага працэсу (з'явы) з сацыяльнымі, эканамічнымі і гістарычнымі ўмовамі.

Вызначэнне асноўных кірункаў аналізу: зместавы, структурны і тэхналагічны.

Тыпавы парадак аналізу навуковых тэкстаў: чытанне навуковай працы; праверка правільнасці ўспрымання; слоўнікавая праца; складанне канспекта твора; уласна аналіз; падрыхтоўка тэзісаў; выступленне з інфармацыяй на занятках па выніках аналізу.

## Тэма 19. Планаванне працы выкладчыка (настаўніка) культуралогіі

Каляндарнае планаванне і яго віды: простыя і разгорнутыя. Перспектыўнае планаванне і яго выкарыстанне пры вывучэнні манаграфічных прац па культуралогіі. Віды перспектыўнага планавання: тэматычна-паўрочнае, тэматычна-мэтавае.

Формы каляндарнага і перспектыўнага планавання.

Бягучае (паўрочнае) планаванне. Каляндарнае і тэматычнае планаванне як аснова будучага планавання.

Рабочыя планы і іх віды: план-канспект, тэзісны план, схематычны план. Распрацоўка рабочага плана на аснове праграмы. Структура ўзорнага рабочага плана па культуралогіі.

Тэхналагічная карта заняткаў па культуралогіі як частка перспектыўнага планавання.

## Тэма 20. Улік і ацэнка культуралагічных ведаў навучэнцаў

Віды ўліку ведаў: дзесяцібальная сістэма ацэнкі ведаў; пяціўзроўневы падыход да ацэнкі ведаў.

Параметры ацэнкі ведаў навучэнцаў: будова адказу, змястоўнасць, навуковасць, арыгінальнасць, моўнае афармленне.

Бягучы ўлік. Абагульняючы ўлік. Індывідуальна-разавы ўлік.

Узроўні ўліку ведаў навучэнцаў: рэцэптыўны, рэцэптыўна-рэпрадуктыўны, рэпрадуктыўна-прадуктыўны, прадуктыўны, прадуктыўна-творчы.

Тэсціраванне як від ацэнкі. Асноўныя патрабаванні да стварэння тэставых заняткаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Аванесов, В.С.* Форма тестовых заданий: учеб. пособие для учителей школ, лицеев, преподавателей вузов и колледжей / В.С. Аванесов. – М.: “Центр тестирования”, 2005. – 156 с.

2. *Амоношвили, Ш.А.* Размышление о гуманной педагогике / Ш.А. Амоношвили. – М., 1995. – 496 с.

3. *Асвета* і педагагічная думка на Беларусі: са старажытнасці да пачатку XX ст. – Мінск: НІА, 1995. – Ч. 1. – 172 с.

4. *Вишнякова, Н.Ф.* Основы педагогического мастерства / Н.Ф. Вишнякова. – Минск : Университетское, 2000. – 246 с.

5. *Гессен, С.* Основы педагогики. Введение в прикладную философию / С. Гессен. – М.: Школа-Пресс, 1995. – 447 с.

6. *Генецинский, В.М.* Основы теоретической педагогики: учеб. пособие / В.М. Генецинский. – М.: Прометей, 1992. – 528 с.

7. *Дзесяцібальная* сістэма ацэнкі ведаў. Прыкладныя нормы. – Мінск, НМЦэнтр, 2002. – С. 21.

8. *Дубинина, А.П.* Культурология: методические указания для самостоятельной подготовки студентов / А.П. Дубинина. – Могилев: Белорусско-Российский ун-т, 2004. – 25 с.

9. *Кабуш, В.Т.* Формирование гуманистической системы воспитания: учеб.-метод. пособие / В.Т. Кабуш. Ин-т повышения квалификации и переподгот. руководящих работников и специалистов образования. – Минск, 1995. – С. 36.

10. *Канцэпцыя* адукацыі і выхавання ў Беларусі // Адукацыя і выхаванне. – 1993. – № 12.

11. *Лернер, И.Я.* Дидактические основы методов обучения / И.Я. Лернер. – М.: Педагогика, 1981. – 186 с.

12. *Махмутов, М.М.* Современный урок / М.М. Махмутов. – М.: Просвещение, 1981. – 186 с.

13. *Оконь, В.* Введение в общую дидактику / В. Оконь. – М.: Высш. шк., 1990. – 381с.

14. *Подласый, М.П.* Педагогика / М.П. Подласый. – М.: Высшее образование, 2009. – 540 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*15. Серкутьев, Г.В.* Формы и методы организации теоретического обучения / Г.В. Серкутьев. – Минск: НМЦентр, 1996. – 88 с.

*16. Харламов, М.Ф.* Педагогика: учебник / М.В. Харламов. – 6-е изд. – М.: Гардарики, 2005. – 516 с.

*17. Чачот, В.У.* Педагогіка сямейнага выхавання / В.У. Чачот. – М.: Высш. шк., 1972. – 286 с.

*18. Фришман, И.И.* Методика работы педагога дополнительного образования: учеб. пособие для студентов высш. пед. учеб. заведений / И.И. Фришман. – 2-е изд., стер. – М.: Издательский центр "Академия", 2004. – 160 с.

*19. Языкович, В.Р.* Культурология: методические указания / В.Р. Языкович. – Минск: Бел. гос. аграрный технический ун-т, 2005. – 23 с.

*Дадатковая*

*1. Барыс, С.* Праграма факультатыва па беларускім фальклоры (5–6 класы) / С. Барыс // Роднае слова. – 1990. – №10. – С. 52–56.

*2. Выкарыстанне* інавацыйных тэхналогій у арганізацыі дыстанцыйнага навучання студэнтаў-завочнікаў: матэрыялы навук.-метад. канф. (2–3 лютага 1998 г.) / рэдкал.: А.І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. ун-т культуры, 1998. – 198 с.

*3. Грыгаровіч, Я.Д.* Прыкладная культуралогія: вучэб. дапам. для студэнтаў спецыяльнасці "культуралогія" ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / Я.Д. Грыгаровіч, А.І. Смолік. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2005. – 216 с.

*4. Леднев, В.С.* Содержание образования: сущность, структура, перспектива / В.С. Леднев. – М.: Высш. шк., 1991. – 224 с.

*5. Ляшук, В.Я.* Урокі-семінары / В.Я. Ляшук // Роднае слова. – 1993. – № 6. – С. 34–38.

*6. Рыданова, М.М.* Основы педагогического общения / М.М. Рыданова. – Минск, 1998.

*7. Скаткин, М.Н.* Методология и методика педагогических исследований / М.Н. Скаткин. – М.: Педагогика, 1986. – 152 с.

*8. Смолік, А.І.* Культуралогія: тэорыя і гісторыя культуры: вучэб. дапам. / А.І. Смолік, Л.К. Кухто. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 281 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. *Смолік, А.І.* Культуралогія: гісторыя культуры: вучэб. дапам. / А.І. Смолік, Л.К. Кухто, А.А. Цобкала. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 311 с.

10. *Сацыяльна*-гуманітарныя навукі ў сістэме вышэйшай школы: матэрыялы навук.-метад. канф. (5–6 лютага 2002 г.) / рэдкал.: А.І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т культуры, 2002. – 242 с.

11. *Шляхі* павышэння эфектыўнасці кіруемай самастойнай работы студэнтаў: матэрыялы навук.-метад. канф. (14 лютага 2008 г.) / рэдкал.: Р.А. Ровіна (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУ культуры і мастацтваў, 2009. – 218 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ПЕДАГОГІКА І МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ДЫСЦЫПЛІН**

*Праграма дзяржаўнага экзамену для студэнтаў напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01 Культуралогія (фундаментальная) спецыялізацыі 1-21 04 01-01 01 Тэорыя і гісторыя культуры*

Карэктар В.Б.Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л.М.Мельнік

Падпісана ў друк 2011 г. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 1,38. Ул.-выд. арк. 0,96.
Тыраж экз. Заказ .

УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў".
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.
Ліцэнзія № 02330/0131818 ад 02.06.2006 г.

Надрукавана на рызографе
УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў".
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ